**Круглік Людміла**

## Любажанка

Сонца, лета, цёпла зранку.
Побач з хатай – Люба з Жанкай.
І гладзіць на іх з бязмежжа
Год суровы – сорак першы.

Люба, Жанка кліча маці…
Дзень лагодны шчасце страціў…
І змяшаліся з крывёю:
Жыта, кветкі над травою.

Люба, Жанка – Любажанка
Слуп агню там таньчыў зранку.
“Люба, Жанка!” – стогне вецер…
Хат няма, згарэлі дзеці.

І ніхто знайсці не можа
Соні, Мішы і Сярожы….
Колькі год ад ліхалецця…
З траў счарнелых – вочы смерці.

А з-пад іх, нябыта з печы,
Ценем – воблік чалавечы…
Вые сцюжа: “Люба, Жанка,
Што не едзеце на санках?”

Нават ёй не зразумела:
Вёска дзе? Чаму згарэла?
Запусцелая дарога.
Тут з вайны няма нікога.

Не смяюцца Люба з Жанкай
З вёскі добрай Любажанка…
Б’юць званы – сорак чацвёрты,
Па жыцці заўчасна сцёртым.